ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 133 (1100) | АЎТОРАК, 10-га чэрвеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.
Кошт асобнага №—2 кап.

XIII зьезд комуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі

ПРАМОВА тав. ГАНТМАНА

У спрэчках, якія разгарнуліся па дакладу ЦК КП(б)Б як на Менскай партконфэрэнцыі, так і на XIII зьезьдзе КП(б)Б, цэлы рад таварышоў шмат часу, шмат увагі ўдзяляюць некаторым памылковым формулёўкам, якія былі дапушчаны т. Васілевічам на працягу раду год.

Тав. Тамашэўскі ў сваім выступленьні ставіў пытаньне так—ці можна крытыкаваць паасобных членаў ЦК, або бюро ЦК. Я лічу, што партыя добра ведае аб тым, што ня толькі можна, але патрэбна памылкі кагобы там ні было, няхай гэта будзе радавы комуністы, хай гэта будзе кіруючы працаўнік, калі ён дапушчае ў сваёй рабоце памылкі, няправільныя формулёўкі, дык трэба іх крытыкаваць. І наша партыя рашуча змагаецца з усякімі спробамі рэгляментаваць, абмяжоўваць бальшавіцкую самакрытыку. Наша партыя рашуча змагаецца з усякімі спробамі трацкістых, опортуністычных элемэнтаў у радох нашай партыі скарыстаць самакрытыку для барацьбы супроць генэральнай лініі партыі, скарыстаць самакрытыку ў мэтах дыскрэдытацыі партыйнага кіраўніцтва.

Але-ж, побач з гэтым, наша партыя і ЦК КП(б)Б змагаліся і будуць змагацца з усялякага роду спробамі абмяжоўваць самакрытыку. Наконт тых памылак у выступленьні т. Васілевіча на якія указвалі цэлы рад таварышоў: першае выступленьне яго на пленуме Менскага АК. Члены бюро ЦК, якія знаёміліся са стэнограмай выступленьня т. Васілевіча, наколькі мне вядома зусім згодны і лічаць выступленьне т. Васілевіча на пленуме Менскага АК правільным. Як вядома, сэнс выступленьня т. Васілевіча многімі таварышамі зводзіцца да таго, што ён даў правільны адказ на няправільнае выступленьне т. Гершона, які ставіў пытаньне такім чынам што пастанова ЦК партыі аб колектывізацыі Беларусі ў асноўным у канцы 1931 г. зьяўляецца першай крыніцай усіх памылак, памылкай усіх памылак.

Ці правільна такая пастаноўка пытаньня? Ці правільна такая орыентацыя партыйнай організацыі? Не, няправільна. Я ня маю магчымасьці азнаёміць вас з усім выступленьнем т. Васілевіча, але магу прачытаць толькі паасобныя месцы для таго, каб не асталося ў зьезду няпэўнае ўражаньне, бо тут было сказана, што т. Васілевіч даў адпор т. Гершону за тое, што ён быццам-бы сказаў, што ЦК ня хоча прызнаць памылак. Вось гэтае месца:

„Бюро ЦК КП(б)Б яшчэ 17 красавіка апрацавала дакумант, у якім з усёй бальшавіцкай рашучасьцю паставіла пытаньне аб сваіх памылках у пытаньнях правядзеньня колектывізацыі. Гэтаму дакуманту, як і ўсёй лініі ЦК КП(б)Б дадуць належную ацэнку раённыя і акруговыя партконфэрэнцыі, што зараз адбываюцца, а таксама надыходзячы партыйны зьезд.

І далей: „Я ўпэўнен у тым, што гэта ацэнка будзе станоўчая, што бюро ЦК зрабіла неабходны крок, правільна паступіла, прызнаючы свае памылкі і гэтым самым мобілізуючы ўсю КП(б)Б на хутчэйшае выпраўленьне дапушчаных скрыўленьняў лініі партыі“.

А дзе-ж тут т. Васілевіч хаваў памылкі ЦК партыі? Ставіў ён гэтае пытаньне, мне здаецца, зусім правільна.

„Бюро ЦК нясе адказнасьць за памылкі, якія былі ім дапушчаны, але ўзвальваць на ЦК партыі ўсё, што каму-небудзь захочацца—гэта недапушчальная справа, да гэта і не ў асцярожнасьці нікому“. Месцы таварышы маюць на ўвазе якраз гэта месца выступленьня т. Васілевіча, абвінавачваючы яго ў тым, што ён выступіў у ролі за іскаючага самакрытыку на пленуме і даваў няправільны адказ. І яшчэ адна вытрымка: „ЦК партыі адказвае за тое, што ня вёў рашучай барацьбы з тэндэнцыямі асобных раёнаў і акруг колектывізаваць вясною гэтага году на ўсе 100 проц.“.

Я думаю, што партыйны зьезд будзе раз дзяліць думку членаў бюро ЦК партыі, што на пленуме Менскага АК т. Васілевіч памылкі не зрабіў. На Кастрычніцкай раённай партыйнай конфэрэнцыі, дзе я зрабіў даклад ад ЦК партыі, дзе я ставіў пытаньне такім чынам, што пленум Менскага АК даў рашучы адпор т. Гершону за яго няправільнае выступленьне, прысутнічалі члены бюро АК, якія не супярэчылі супроць гэтага. Я лічу, што яны зусім згодны з тым, што выступленьне т. Гершона зьяўляецца няправільным. І пасьля гэтага, калі паасобныя таварышы—(я лічу, што гэта ня думка членаў бюро Менскага АК)—паасобныя таварышы б'юць т. Васілевіча за гэтае выступленьне, гэта зьяўляецца няправільным.

Адно на выступленьня т. Васілевіча на пленуме ЦК Комсамолу. Гэта стэнограма таксама ў мяне ёсьць. Я лічу, што асноўная думка т. Васілевіча правільная. Калі вы азнаёміцеся з усёй стэнограмай, вы таксама прызнаеце, што асноўная думка яго зводзіцца да таго, што, ня гледзячы на цэлы рад яскравых партыйных дырэктыў аб усёй політычнай важнасьці работы сярод беднаты усё-ж гэта работа не раскачана, што адной з прычын гэта зьяўляецца тое, што вясковыя організацыі яшчэ і да гэтага часу, нават і пасьля чысткі партыі, засмечаны чужым элемэнтам, мы гэтага адмовіць ня можам, што гэты чужы элемэнт супроцьдзейнічае лініі партыі па разгортваньні работы сярод беднаты. Асноўная думка правільная, але формулёўка т. Васілевіча няправільная. Я ня маю часу агалошаць тыя формулёўкі, якія ён прыводзіў, скажам, тое месца, дзе ён гаворыць наконт серадняка, што серадняк у радох нашай партыі ня здолеў праводзіць партыйную лінію. Гэтае месца зьяўляецца няправільнай формулёўкай.

Я ня буду, таварышы, гаварыць адносна іншых выступленьняў, дзе мы ў выступленьнях т. Васілевіча—гэтага адмовіць нельга,—маем паасобныя няправільныя формулёўкі. Тав. Васілевіч іх прызнаў, тав. Васілевіч, я ў гэтым упэўнен, тут на зьезьдзе з усёй рашучасьцю прызнае, што гэтыя формулёўкі зьяўляюцца няправільнымі. Але, таварышы, ці можам мы параўнаць памылковыя паасобныя выступленьні т. Васілевіча з памылкамі, якія зрабілі некаторыя іншыя таварышы?

Ні ў якім разе не магу параўнаць тыя погляды, тыя правоопортуністычныя, нацыянал-дэмократычныя погляды, якія выказваў т. Чарвякоў у цэлым радзе сваіх выступленьняў на працягу доўгага пэрыоду і якія па правільнай формулёўцы ЦК зьяўляюцца ня цэлай сыстэмай праваопортуністычных і нацыянал-дэмократычных поглядаў, з тымі паасобнымі памылкамі, няправільнымі формулёўкамі, якія даваў т. Васілевіч.

Я лічу, што гэта зьяўляецца асноўным. Па лініі, якую праводзіў той ці іншы член партыі, ці той ці іншы партыйны кіраўнік, правяраецца комуністычная ўстойлівасьць, бальшавіцкая вытрыманасьць, а я сьцьвярджаю, што т. Васілевіч па ўсіх важнейшых пытаньнях, па пытаньню барацьбы з рацкізмам і правым ухілам, па пытаньню барацьбы з прышчэпаўшчынай і па пытаньню барацьбы з нацыянал-дэмократызмам і па пытаньню барацьбы з скажэньнямі, памылкамі, дапушчанымі ў колектывізацыі, разам з усім бюро ЦК партыі змагаўся і рашуча змагаўся, правільна праводзіў партыйную лінію па ўсіх гэтых важнейшых пытаньнях. Я падкрэсьліваю, асабліва па пытаньню барацьбы з нацыянал-дэмократызмам—я лічу, на гэтым пытаньні ў першую чаргу правяраецца цэлы рад беларускіх партыйцаў, што гэта зьяўляецца асёлкам на якім можна і патрэбна правяраць вытрыманасьць партыйнай лініі вытрыманасьць таго ці іншага таварыша.

Я сьцьвярджаю, што лінія т. Васілевіча ў барацьбе з нацыянал-дэмократызмам, ня гледзячы на тое, што тут гаварылі адносна гадавіны БДВ, што, як быццам, тав. Васілевіч не рэагаваў, што па ўсіх гэтых пытаньнях тав. Васілевіч праводзіў правільную лінію партыі, правільна праводзіў лінію ЦК партыі.

Другое пытаньне—аб памылках ЦК партыі. Я лічу, што на гэтае пытаньне трэба даць яскравы адказ, бо тут цэлы рад таварышоў, якія выступалі, пачыналі з таго, што лінія правільная і ўсе іншае, а ў канцы заканчвалі цэлым радам абвінавачаньняў, якія, безумоўна, можна кваліфікаваць, як скрыўленьне правільнай партыйнай лініі. Я лічу, што мы павінны на зьезьдзе на гэта грунтоўнае пытаньне адносна політычнай лініі ЦК партыі даць адказ, не крывя душой.

Адносна прышчэпаўшчыны. ЦК Партыі лічыць і прызнаў, што яна выкрыта была з некаторым спазьненьнем. Гэта правільна. Але ставіць пытаньне так, як т. Смаль, які тут сказаў прыблізна (я не маю стэнограмы, але запісаў прыблізна, што ён сказаў) што „памылкі прышчэпаўшчыны тлумачацца тым, што Цэнтральны Камітэт Партыі быў увесь час пад уплывам дробнабуржуазнай стыхіі“. Гэта значыць узводзіць паклёп на Цэнтральны Камітэт Партыі. Так спазьненьне ў выкрыцьці прышчэпаўшчыны мела месца, але ці можна ставіць так пытаньне, што ЦК тады, калі політычнае значэньне і ўвесь сэнс прышчэпаўшчыны быў выкрыт, не мобілізаваў на 100 проц. усю партыйную організацыю на барацьбу з прышчэпаўшчынай, якая жыла ня толькі ў Наркомземе, але і ў цэлым шэрагу другіх організацый. Я думаю, зьезд адкажа на гэта так, што Цэнтральны Камітэт Партыі мобілізаваў партыйныя організацыі і па-бальшавіцку, з усёй рашучасьцю, паставіў гэтае пытаньне. І іменна, дзякуючы гэтаму, мы маем рашучы паварот ва ўсёй нашай зямельнай працы.

Я лічу, што т. Васілевіч у сваім артыкуле, дзе ён кажа, што ў асноўным КП(б)Б перамагла прышчэпаўшчыну, як політыку, якая орыентавалася на кулацкія гаспадаркі, на хутары, гэта правільная пастаноўка. Гэта ня значыць, што мы ня маем і ня будзем мець праваопортуністычных ухілаў, гэта ня значыць, што нам трэба складаць сваю зброю ў барацьбе з правым опортунізмам. Ні ў якім разе! Я лічу, што той рашучы паварот, які КП(б)Б зрабіла ў колектывізацыі, тыя посьпехі, тая пільнасьць з боку нашай партыйнай організацыі і шырачэзных мас на барацьбу з усякімі элемэнтамі прышчэпаўшчыны, аб гэтым сьведчаць.

Другое грунтоўнае пытаньне—барацьба з нацыянал-дэмократызмам.

Шэраг таварышоў прызналі лінію Цэнтральнага Камітэту ў барацьбе з праявамі нацыянал-дэмократызму правільнымі. Мы ведаем, і шэраг дэлегатаў на зьезьдзе гаварылі аб тым, што ЦК вёў вялікую працу па барацьбе з нацыянал-дэмократызмам і шовінізмам усіх масьцей. Тав. Штэйман упікаў, што вывады тав. Затонскага хаваюцца ад КП(б)Б. Я хачу агаласіць пастанову таго няпоўнага бюро ЦК, якое заслухала папярэднія вынікі (бо гэта было, як правільна сказаў т. Астапенка, не абсьледваньне, а вывучэньне практыкі правядзеньня нацполітыкі па некаторых нацрэспубліках, якое праводзілася па даручэньню ЦК і ЦКК),— Бюро ЦК пастанавіла: „Заслухаўшы папярэднюю інформацыю т. Затонскага Бюро ЦК у сувязі з тым, што з 13 членаў Бюро ЦК 7 членаў адсутнічае, у тым ліку атсутнічае старшыня ЦКК, пастанаўляе: разаслаць стэнограму пасяджэньня Бюро ЦК усім членам Бюро ЦК і Прэзыдыуму ЦКК. Прасіць тав. Затонскага пасьля правядзеньня канчатковых вынікаў абсьледваньня прыехаць у Менск для абгаварэньня на Бюро ЦК гэтых вынікаў“. Была гутарка з т. Затонскім аб скліканьні партыйнага актыву, на якім абгаварыць вынікі абсьледваньня. Тав. Затонскі ня прыехаў; так што Бюро Цэнтральнага Камітэту не хавала і ня мела намеру хаваць гэты дакумэнт ад КП(б)Б і даведка т. Штэймана зьяўляецца такім чынам няправільнай.

Аб колектывізацыі. Цэнтральны Камітэт Партыі сапраўды дапусьціў шэраг памылак у практыцы колгаснага будаўніцтва, аб іх ведае партыйны зьезд і я іх паўтараць ня буду, аб іх гаворыць рэзалюцыя ЦК КП(б)Б ад 17-га красавіка. Я лічу, што іх трэба тут крытыкаваць гэта безумоўна. Але таварышы, політычная лінія Цэнтральнага Камітэту Партыі, па важнейшых грунтоўных пытаньнях, па пытаньню аб нашых адносінах да серадняка, была безумоўна правільнай. І тут ніхто ня можа сказаць, што Цэнтральны Камітэт Партыі ў гэтым грунтоўным пытаньні, у тым, каб не адміністраваць у колгасным будаўніцтве, у тым, каб у адносінах да серадняка захаваць правільную лінію, што ЦК КП(б)Б па гэтаму пытаньню ня даў яснай устаноўкі. ЦК даў шэраг папярэджаньняў, шэраг дакумантаў і ў настанове студнёўскага пленуму і ў лісьце па пытаньню раскулачваньня, які быў разасланы ўсім раённым камітэтам. Цэнтральны камітэт партыі па гэтаму важнейшаму пытаньню, адносна недапушчэньня парушэньня ленінскае лініі да серадняка, праводзіў правільную лінію. ЦК КП(б)Б ня толькі рашуча і па-бальшавіцку прызнаў свае памылкі ў практыцы колгаснага будаўніцтва, але здолеў павярнуць усю КП(б)Б на барацьбу з скажэньнямі і выпраўленьне памылак, рашуча ўдарыў па тых паасобных організацыях і паасобных таварышох, якія ўпарціліся, ня сталі на шлях выпраўленьня памылак своечасова (Шклоў, Рагачоў, Аршанскі АК і інш.).

Далей, адносна працы сярод беднаты. Большасьць таварышоў мусіць чытала і ведае, колькі чоткіх дырэктыў даваў Цэнтральны Камітэт па гэтаму пытаньню, як Цэнтральны Камітэт ставіў з усёй вастратой гэтае пытаньне, як формуляваў студнёўскі пленум ЦК КП(б)Б, што недаацэнка працы з беднатою зьяўляецца горшым відам права-опортуністычнага ўхілу. Ня гледзячы на гэта, мы ўсё-ж на мясцох ня маем яшчэ да гэтага часу рашучага пералому; яшчэ і зараз мы маем опортуністычную недаацэнку працы з беднатою з боку некаторых нашых організацый. У барацьбе за генэральную лінію партыі КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК правяла вялізарнейшую работу. Ніхто з выступаўшых у спрэчках таварышоў не абвінавачвае ЦК у тым, што ён не змагаўся з усёй рашучасьцю з ухіламі ад генэральнай лініі партыі, асабліва з правым ухілам у тэорыі, з опортуністычнай практыкай, з „левымі“ загібшчыкамі і рэшткамі трацкісцкай ідэолёгіі, а таксама з прымірэнцтвам да ўсіх гэтых ухілаў. Іменна на падставе няўхільнай барацьбы за партыйную лінію яшчэ больш узмацнілася адзінства і бальшавіцкая згуртаванасьць шэрагаў КП(б)Б. Гэта зьяўляецца асноўным для ацэнкі політычнай лініі Цэнтральнага Камітэту.

Спынюся яшчэ на адным пытаньні, якое тут было мала закранута ў спрэчках, але якое мае надзвычайна вялікае значэньне, па якому мы ў Цэнтральным Камітэце Партыі маем буйнейшы недахоп. Я маю на ўвазе нашу партыйна-масавую працу, перабудову яе ў адпаведнасьці з тымі задачамі, якія перад намі стаяць. Я лічу, што ў гэтым пытаньні ня маем яшчэ належнага пералому, што гэтай перабудовы работы фактычна ня маем, што мы і ў ЦК партыі і на мясцох да гэтага пытаньня падышлі трохі фармальна, што пры перабудове нашай партыйна-масавай работы мы ня ўлічваем ва ўсёй паўнаце тыя вялікія зьмены, якія мы маем на прадпрыемствах і асабліва на вёсцы. На прадпрыемствах, дзе мы маем шырачэзны ўдарніцкі рух, дзе мы маем у асобе ударнікаў моцны рабочы актыў, які зьяўляецца рэзэрвам, адкуль партыя чэрпае лепшыя свае сілы, пры дапамозе якога мы праводзім і будзем праводзіць усе нашы важнейшыя пытаньні па соцыялістычнаму будаўніцтву, мы яшчэ не перабудавалі ўсёй нашай партыйна-масавай работы ў адпаведнасьці з тым вялікім зрухам, які мы маем у рабочай клясе.

З другога боку, мы ня ўлічваем, што рабочая кляса ў нас на Беларусі значна амаладзілася. З 1-І—26 г. за тры гады рабочая кляса ўзрасла больш чым у два разы: з 24 тысяч да 45 з лішкам тысяч. Палова рабочых не прашлі яшчэ належнай пролетарскай школы.

Я лічу, што мы ў нашай рабоце ня ўлічваем усёй адказнасьці гэтага пытаньня, пытаньня політычна-клясавага выхаваньня новых слаёў рабочых, якія ўліліся ў нашу прамысловасьць. Мы ня ўлічваем таго, што ў нас на прадпрыемствах Беларусі толькі 53 проц. старых рабочых, што 47 проц. складаюць выхадцы з сялян, значная частка якіх яшчэ зьвязана з зямлёю, былыя саматужнікі і іншых, якія зьяўляюцца выхадцамі з дробна-буржуазнага асяродзьдзя, ня ўлічваем усяго гэтага,—і наша політычна-выхаваўчая работа да гэтага часу яшчэ слабая.

Тут гаварылі аб тым, што пашыралася соцыяльная база на вёсцы. Мы на сёнешні дзень маем усяго 3049 колгасьнікаў комуністых, у той час як у колгасах мы маем 73.000 сямей. Надзвычайная тонкая праслойка, не гаворачы аб тым, што праслойка партыйцаў наогул на вёсцы зьяўляецца надзвычайна невялікай (10.024 вясковых комуністых на 775 тысяч сялянскіх сямей).

Мне думаецца, што нам неабходна больш рашуча ўцягваць у партыю пролетарскія і напоўпролетарскія элемэнты на вёсцы, колгасьнікаў беднякоў і лепшых сераднякоў. Нам трэба перабудаваць нашу работу і на прадпрыемствах і на вёсцы, выходзячы галоўным чынам з тых новых зьмен, якія мы маем, асабліва на вёсцы.

Пытаньне наконт партыйных кадраў. Тут цэлы шэраг таварышоў закранулі гэтае пытаньне. Я хачу зрабіць адну заўвагу па пытаньню партыйных кадраў. Дрэнна абстаіць з гэтым справа. Мы нядаўна падлічылі, колькі комвуз даў на працягу 3-х год партыйных работнікаў і аказалася, што 16 сэкратароў Райкомаў, ды і то некаторыя з іх, наколькі мне вядома, зьняты. 16 сэкратароў райкому—на працягу трох год. Я лічу, што гэта зьяўляецца ненармальным, што наш Комвуз—асноўная кузьня для Беларусі для падрыхтоўкі партыйных работнікаў, для падвышэньня іх політычнага ўзроўню патрабуе зьмены, адчувае патрэбу ў тым, каб перагледзець усю работу Комвузу. Я лічу, што тут зусім правільны папрок, які рабіўся па адрасу ЦК аб тым, што мы мала робім для таго, каб падрыхтаваць, для таго, каб узьняць тэорэтычны ўзровень партыйных работнікаў. Я вядома, ня згодзен з некаторымі паасобнымі таварышамі, якія ставілі пытаньне, што памылкі якія былі на вёсцы пры колектывізацыі, тлумачацца выключна політычнай непадрыхтаванасьці. Гэта няправільна, але тое, што мы мала зрабілі ў гэтым напрамку,—правільна. І я лічу, што нам трэба перабудаваць работу Комвузу, каб ён даваў значна больш шырокую продукцыю. Нам трэба організаваць сталыя курсы пры Комвузе, праз якія прапусьціць увесь склад кіруючых партыйных работнікаў, у першую чаргу кіруючых партработнікаў, якія працуюць на вёсцы.

Дзеньнік XIII зьезду КП(б)Б

На ранішнім пасяджэньні 9 чэрвеня былі заслуханы даклады т. т. Галадзеда і Рачыцкага аб калгасным руху і ўздыме сельскай гаспадаркі.

У спрэчках па дакладах выступілі т. т. *Ахроменка, Бухаркін, Ярмолін, Дунец, Казлоўскі, Лабадаеў і Разумаў*.

На вячэрнім пасяджэньні ў спрэчках выступілі т. т. *Балцін, Мышалаў, Дубіна, Колодка, Шпак, Качук, Міцькоў, Рашэтнікаў, Гарачун, Буйко, Азаронак, Славінскі і Масюкоў*.

У канцы пасяджэньня зьезд вітала дэлегацыя ад Барысаўскіх фабрык і заводаў.

А рабочых гуты імя Домбаля зьезд вітаў тав Сташкевіч, ад фабрык „Чырвоная Бярэзіна“ і „Пралетарскай перамогі“ зьезд вітала тав. Крупец, ад фабрык Камінтэрн, Профінтэрн, і Розы Люксэмбург зьезд вітаў тав. Зордзін, ад чыгуначнікаў ст. Барысава тав. Сарока.

З адказам на прывітаньні ад імя зьезду выступіў т. Галадзед.

ШКМ--кузьня колгасных кадраў

Рашучая і тэрміновая рэарганізацыя ўсёй масавай сыстэмы народнай асьветы на вёсцы ў школы колгаснай моладзі—забясьпечыць пасьпяховае выкананьне дырэктыў партыі аб падрыхтоўцы кадраў для колектывізаванай сельскай гаспадаркі

КОЖНАЯ ШКМ—УДАРНАЯ БРЫГАДА КОЛЕКТЫВІСТЫХ

Заваяваць права на назву ШКМ

Рашэньне колегіі НКА і ЦК ЛКСМБ аб рэарганізацыі другога концэнтру вясковай школы ў школы колгаснай моладзі мае бясспрэчна велізарнейшае значэньне. Ажыцьцяўленьне гэтага рашэньня павінна стаць у цэнтры ўвагі ня толькі органаў народнай асьветы, але і ўсёй савецкай грамадзкасьці і перш за ўсё—організацыі комсамолу.

На больш пагражаючай нам небясьпекай зьяўляецца **формальнае** праводжаньне рэорганізацыі, пры якой, па сутнасьці, школа застанецца старой, а зьменіцца толькі яе назва. Так праведзеная „рэорганізацыя“ прынясе нам велізарную шкоду, выправіць якую магчыма будзе толькі з вялікай цяжкасьцю, бо яна надоўга дыскрэдытуе самую ідэю, самую назву «школы колгаснай моладзі“.

Права на назву ШКМ павінна быць **заваявана кожнай вясковай школай.**

Зьмену назвы неабходна папярэдзіць падрыхтоўчай працай, якая забясьпечыць карэнную **зьмену самога зьместу** работы.

Толькі тая школа, якая моцна зьвязана з колгасам, якая організуе сапраўдны ўдзел школьнікаў у вытворчым і грамадзкім жыцьці колгасу (саўгасу)—мае права на назву ШКМ.

Толькі школа, у якой будзе забясьпечана вывучэньне такіх дысцыплін, як колектывізацыя і кооперыраваньне сельскай гаспадаркі, школа, якая дасьць сваім вучням веды па паляводзтву, жывёлагадоўлі і г. д.—будзе па сутнасьці школай колгаснай моладзі.

Толькі школа, у якую будзе ўцягнута наша батрацкая, бядняцкая, колгасная моладзь, школа, якая даб'ецца для гэтай моладзі матар'яльнага падтрыманьня (з боку Колгасцэнтру, коопэрацыі, камітэтаў ўзаемадапамогі і г. д.) і тым самым ліквідуе адсеў лепшай у соцыяльных адносінах часткі школьнікаў, толькі такая школа будзе сапраўды школай колгаснай моладзі. Тыя школы, якія прымуць новую назву, а ўсяго гэтага ня выканаюць—будуць „ілжэ-колгаснымі школамі“, яны толькі дыскрэдытуюць вялікую ідэю школ колгаснай моладзі.

А правесьці ўсё гэта зусім ня лёгка. Гэта патрабуе велізарнага напружаньня сіл і, перш за ўсё, мобілізацыі навокал гэтай справы ўсяго комсамолу.

Органы Народнай Асьветы павінны цьвёрда зразумець, што апаратным шляхам гэтай работы не правядзеш, яны павінны ўсю працу па рэорганізацыі правесьці як шырокую грамадзкую кампанію, а для гэтага органы народнай асьветы павінны працаваць у цясьнейшым контакце з комсамолам.

Школы колгаснай моладзі зьяўляюцца „Дзецішчам“ комсамолу. Рашэньне колегіі НКА і ЦК ЛКСМБ зьяўляецца перамогай ШКМ, а значыць і перамогай комсамолу. Але, калі да гэтага часу комсамол (як і Наркомасьветы і яго органы) не заўсёды свайму „дзецішчу“ удзяляў да олі ўвагі, дык зараз комсомолам павінен быць зроблен круты паварот тварам да ШКМ. Комсамол павінен правесьці вялікую кампанію па рэорганізацыі і дапамозе ШКМ. Раённыя організацыі комсамолу павінны ўзяць на сябе шэфства над кожнай школай свайго раёну, найуважлівейшым чынам сачыць за іх працай, неадкладна-ж ліквідаваць усе прарывы пры іх малейшым выяўленьні і аказваць ім усякае падтрыманьне.

За работу трэба прыняцца зараз-жа. Органы Народнай Асьветы, комсамольскія організацыі, органы Колгасцэнтру павінны зараз-жа распрацаваць конкрэтны плян працы і прыступіць да яго ажыцьцяўленьня такім тэмпам, каб максымальная колькасьць школ, ужо з самага пачатку навучальнага году распачала працу, як школы колгаснай моладзі.

К канцу гэтага навучальнага году мы павінны будзем правесьці агляд усіх школ колгаснай моладзі, і гэта будзе агляд, будзе конкурс, ня толькі на лепшую ці горшую школу, ня толькі на лепшага ці горшага інспэктара па народнай асьвеце,—гэта будзе агляд на лепшую ці горшую організацыю комсамолу.

Рыўлін.

ШКМ і колгасы

ШКМ на шырокай аснове політэхнізацыі павінна рыхтаваць кадры масавай кваліфікацыі для аграмаджанага сэктару сельскай гаспадаркі, якіх магчыма было скарыстаць з цягам часу на практычнай рабоце ў колгасе, у якасьці брыгадзіраў паляводзтва, брыгадзіраў стадол, трактарыстых, кантроль асыстэнтаў і г. д.

У залежнасьці ад гэтага, кожная ШКМ павінна прыняць адпаведны напрамак (паляводчы, жывёлагадоўчы, ільнаводчы, трактарны і г. д.), пабудаваць сваю працу на вытворчым пляне колгасу і, пераключыўшыся на рэволюцыйныя тэмпы работы, падняць свае паказчыкі (колькасна і якасна), каб быць сапраўдным організатарам соцыялістычнай перабудовы вёскі.

З тымі колгасамі, дзе мэханізацыя ахапіла ўжо асноўныя процэсы вытворчасьці (сельска-гаспадарчая арцель, комуна), ШКМ, на падставе асноўнага дагавору з колгасам, павінна аб'яднаць сваю школьную гаспадарку: у такім выпадку ўсе сродкі вытворчасьці ШКМ пераходзяць у непадзельны фонд колгасу.

Пры якіх-жа ўмовах ШКМ зможа выканаць ускладзеныя на яе абавязкі рэконструкцыйным пэрыодам перабудовы ўсяе народнае гаспадаркі на соцыялістычны лад? Неабходна, каб з боку колгасаў былі складзены ўсе ўмовы для пасьпяховага выкананьня ШКМ пераліченых вышэй задач.

Перш за ўсё колгас павінен забясьпечыць ШКМ для вучэбнай мэты неабходным вучасткам зямлі патрэбнымі машынамі для яго апрацоўкі, групай жывёлы на колектыўным двары і г. д.

Колгасам патрэбна скласьці асобны фонд вучобы для матар'яльнага забясьпечаньня вучняў ШКМ да 14 год і гарантаваць выплату заработку вучням 14 год і вышэй, памятаючы, што іх праца ў колгасе мае вытворчую для яго каштоўнасьць.

Колгас прымае ўдзел ва ўсім жыцьці ШКМ шляхам вылучэньня сваіх прадстаўнікоў у школьны савет і прыймовую камісію. Колгасу надана права пасылкі сваіх кандытаў у ШКМ.

ШКМ павінна прыняць шчыры ўдзел у працы вытворчай камісіі колгасу. ШКМ і колгасу неабходна наладзіць такія ўзаемаадносіны, якія дапамагалі-б у працы аднаму.

Насустрач гэтаму павінны прыйсьці Белколгасцэнтр выдачай адпаведнай пастановы.

Пастанова павінна гарантаваць ШКМ матар'яльную дапамогу з боку колгасаў, забясьпечыць ШКМ вытворчае навучаньне і вытворчую практыку ў колгасе.

Белколгасцэнтру і яго мясцовым органам неабходна правесьці шырокую растлумачальную работу.

Толькі пры гэтых умовах ШКМ зможа выканаць задачы, ускладзеныя на яе комуністычнай партыяй, комсамолам і савецкай уладай.

М. А. Жыгмунт.

ПАСТАНОВА

колегіі Наркомасьветы і бюро ЦК ЛКСМБ аб перабудове школ сялянскай моладзі ў зьвязку з сучаснымі задачамі на вёсцы

I.

1. Шпаркі тэмп сельскае гаспадаркі на новых соцыялістычных пачатках патрабуе перабудовы ШСМ і ўсяе масавае асьветы на вёсцы ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі буйнае соцыялістычнае сельскае гаспадаркі.

2. Сучасны рост сеткі ШСМ і яе мэтавая ўстаноўка не адказваюць задачам політэхнічнага выхаваньня дзяцей і тэмпаў колектывізацыі сельскай гаспадаркі.

3. ШСМ на бліжэйшы пэрыод павінна будавацца над першым концэнтрам сямігодкі і зьяўляецца адзіным тыпам II-га концэнтру сямігадовае політэхнічнае школы ў вёсцы.

4. Выходзячы з агульнай устаноўкі лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) і другой усесаюзнай партыйнай нарады, работа ШСМ павінна вымярацца ступеньню выкананьня задач—політэхнічнага выхаваньня дзяцей, падрыхтоўкі організатараў і працаўнікоў колектыўных форм гаспадаркі, абслугоўваньня вытворчых і культурна-бытавых патрэб аколіючага колгасу, дапамогі далейшаму росту колгасаў у раёне і ахопу дзяцей батракоў і беднаты (у першую чаргу дзяцей колгасьнікаў)

5. У адпаведнасьці з новымі задачамі ШСМ, колегія Народнага Комісарыяту Асьветы і бюро ЦК ЛКСМБ пастанаўляюць:

1. Усім існуючым школам сялянскай моладзі надаць назву: „Школ колгаснай моладзі“.

2. У 1930-31 годзе ўсе другія концэнтры сямігадовае і 9-ці гадовае школы ў вёсцы рэорганізаваць па зьместу працы школ колгаснай моладзі, надаўшы гэтым школам назву „ШКМ“.

3. Забясьпечыўшы політэхнічнае выхаваньне дзяцей, ШКМ павінна даваць такі аб'ём ведаў, каб быць крыніцай папаўненьня тэхнікумаў і вышэйшых навучальных установаў, а таксама і адрыхтоўваць кадры масавай кваліфікацыі для аграмаджанага сэктару сельскай гаспадаркі, скарыстоўваючы іх з цягам часу ў якасьці брыгадзіраў паляводзтва, брыгадзіраў колектыўных стадолаў, трактарыстых, кантроль-асыстэнтаў і г. д.,—для чаго кожная ШКМ павінна прыняць, на шырокай аснове політэхнізацыі, спэцыяльны напрамак (паляводча-трактарны, жывёлагадоўлі, ільнаводчы і г. д.). Прычым аднакамплектавыя школы прымаюць спэцыяльны напрамак у адпаведнасьці з асноўным характарам гаспадаркі ў раёне, а ў шмат комплектавых школах роўналеглыя групы прымаюць розныя напрамкі.

Неабходна рэзка павялічыць у програмах ШКМ вывучэньне сельскагаспадарчых машын і тым самым наблізіць ШКМ да тыпу агра-індустрыяльнай школы, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на скарыстаньне, правільную організацыю вытворчага навучаньня, агрокомбінатаў і падсобных прадпрыемстваў колгасаў для атрыманьня ўсіх вытворчых звычак, зьвязаных з процэсам, як здабычы сельска-гаспадарчых продуктаў, так і іх апрацоўкі.

5. ШКМ хуткай і рашучай, сапраўды рэволюцыйнай перабудовай вучэбнай, вытворчай і грамадзка-карыснай работы, павінны заваяваць сваё права на новую назву і перайсьці на больш высокія (карысна і якасна) паказчыкі сваёй работы і стаць значным фактарам соцыялістычнай перабудовы вёскі.

6. У далейшым узяць напрамак разгортваньня сеткі ШКМ такім тэмпам, каб к канцу пяцігодкі забясьпечыць ёю 25 проц. дзяцей працоўнага сялянства (у першую чаргу дзяцей батракоў і беднаты) ад 12 да 15 год.

II.

1. Выкарыстоўваньне працы падлеткаў і моладзі ў колгасах павінна быць падпарадкавана задачам вытворчага навучаньня.

2. Вытворчае навучаньне практыка вучняў адначасова зьяўляецца формай скарыстаньня іх працы ў колгасе; раходжаньне програмы вытворчага навучаньня і практыкі павінна насіць характар выхаваньня вытворчых заданьняў колгасу і мець гаспадарчую каштоўнасьць для яго.

3. У залежнасьці ад гэтага, матар'яльнае забясьпечаньне вучняў носіць форму альбо заработку (для падлеткаў ад 14 і вышэй), альбо складаньня ў колгасах асобнага абагуленага фонду вучобы для падлеткаў 14 год.

4. Школа аб'ядноўвае сваю вучэбную гаспадарку і сродкі вытворчасьці з колгасамі, а там дзе мэханізацыя ахапіла ўжо асноўныя процэсы ў гэтых колгасах, школа ўносіць сродкі вытворчасьці ў непадзельны капітал колгасаў, якія з свайго боку, забясьпечваюць школу для вучэбнай мэты спэцыяльным комплектам сельска-гаспадарчых машын і прыладаў, спэцыяльнымі групамі жывёлы на колектыўных дварох, спэцыяльнымі вучасткамі ў эканоміі для апрацоўкі іх вучнёўскімі брыгадамі і г. д.

5. Узаемныя абавязкі школы і колгасаў афармляюцца асобнымі дагаварамі.

6. У раёнах, якія яшчэ не зьяўляюцца раёнамі суцэльнай колектывізацыі, кожная школа павінна быць прымацавана да пэўных колгасаў і саўгасаў, якія павінны зьявіцца асноўнай базай вытворчага навучаньня і практыкі вучняў ШКМ.

III.

Прымаючы пад увагу перавод ШКМ на ўдарнае палажэньне, колегія НКА лічыць патрэбным

1. З 30-31 навучальнага году перавесьці ўсе ШКМ на бесьперапынны вучэбна-вытворчы год, устанавіўшы 256 рабочых дзён (пры пяцідзённым тыдні), павялічыць лік гадзін на вытворчае навучаньне, надаўшы яму бесьперапынны характар і ўвесьці практыку ў колгасах для ўсіх трох гадоў навучаньня.

2. З 1930 г. праводзіць комплектаваньне ШКМ шляхам вылучэньня кандыдатаў у школы саветамі, колгасамі і грамадзкімі організацыямі. Кожна організацыя, якая пасылае ў школу кандыдатаў, павінна ўзяць на сябе абавязкі матар'яльнай дапамогі камандыруемым.

3. Абавязаць райінспэктароў Народнай Асьветы і ШКМ у раёнах суцэльнай колектывізацыі падрыхтаваць у спэцыяльных гуртках і групах у ШКМ усю батрацкую моладзь раёну, у астатніх раёнах давесьці процэнт прыёму батракоў ня менш чым да 30 проц., дзяўчаты ў прыёме бягучага году павінны складаць ня менш 45 проц.

4. Не пазьней 1930-31 навуч. году цалкам ліквідаваць адсеў з ШКМ і другагодніцтва забясьпечыўшы школы адпаведнымі стыпэндыяльнымі фондамі.

5. Устанавіць колькасьць вучняў у групе ў 40 асоб.

Маючы на ўвазе наяўнасьць у колгасах значнай колькасьці падлеткаў і моладзі з рознаведнай падрыхтоўкай, колегія знаходзіць патрэбным пабудаваць усю сыстэму павышанай асьветы на вёсцы такім чынам, каб рознымі тыпамі школ забясьпечыць ахоп усіх падлеткаў і моладзі аграмаджанага сэктару сельскай гаспадаркі.

З гэтай прычыны НКА прапануе, разам з існуючымі зараз дзённымі і вячэрнімі ШКМ, разгарнуць новы тып паскоранай дзённай ШКМ і зацьвярджае наступныя асноўныя палажэньні яе організацыі:

1. Увесь пэрыод навучаньня—450 раб. дзён, з падзелам яго на 3 часткі—па 150 рабочых дзён у кожнай.

2. Прыём і выпуск рабіць два разы—1-га сакавіка і 15-га верасьня.

3. Бесьперапынны вучэбна-вытворчы год.

4. Організуюцца выключна пры колгасах.

5. Прыймовы ўзрост ад 16—да 19 г. з папярэдняй падрыхтоўкай у межах 4-х годкі.

6. Устанаўліваецца 8-гадзінны рабочы дзень з падзелам яго на 4 гадзіны працы ў колгасе, па сыстэматычнай програме вытворчага навучаньня, і 4 гадзіны тэорэтычнага навучаньня.

7. Работа вучняў у колгасе аплачваецца на аднолькавых падставах з усімі колгасьнікамі.

8. Колегія НКА лічыць патрэбным у 30-31 годзе адчыніць па адной дзённай скарочанай школе колгаснай моладзі на кожны раён, па 40 асоб у групе.

9. Рост сеткі вячэрніх ШКМ павінен адказваць тэмпу разьвіцьця сеткі звычайных ШКМ, паставіўшы ў абавязак каб пры кожнай звычайнай ШКМ існавала вячэрняя ШКМ.

10. Прапанаваць навукова-мэтодолёгічнаму камітэту да 1-га жніўня распрацаваць і выдаць програмы для скарочанай дзённай і вячэрняй ШКМ, а таксама палажэньні аб організацыі вытворчага навучаньня ў гэтых школах.

IУ

Для ажыцьцяўленьня вызначанай програмы будаўніцтва ШКМ колегія НКА лічыць неабходным:

1. Утрыманьне ШКМ павінна праводзіцца па мясцоваму бюджэту. Для палепшаньня матар'яльнага становішча гэтых школ прыцягваюцца сродкі колгасаў і коопэрацыйных організацый, якія вызначаюцца па кожнай школе дагаварамі рай выканкому і коопэрацыйнымі організацыямі.

2. Прасіць СНК БССР—спэцыяльнай пастановай абавязаць НКФ і АВК прадугледзець каштарысным мерапрыемствам... ваньнямі водпуск патрэбных сродкаў на адчыненьне вячэрніх і дзённых ШКМ

3. Паставіць перад усёй колгаснай сыстэмай пытаньне аб прыцягненьні спэцыялістых колгасаў у рабоце ШКМ.

У

1. Як існуючай сеткай ШКМ, так і нова-адчыняемай у першую чаргу павінны быць забясьпечаны школай дзеці рабочых колгасу.

2 Прапанаваць Акрана палепшыць склад настаўнікаў і агрономаў ШКМ, шляхам укомплектаваньня іх за кошт лепшай часткі канчаючых у бягучым годзе БДУ і сельска-гаспадарчую Акадэмію.

3. Прапанаваць навукова-мэтодолёгічнаму камітэту ў месячны тэрмін распрацаваць мерапрыемствы па падвышэньню кваліфікацыі існуючых пэдагогічных кадраў ШКМ

4. Колегія НКА адзначае слабое кіраўніцтва ШКМ як з боку НКА так і акруговых інспэктырыятаў Народнай Асьветы, з якой прычыны лічыць патрэбным: а] устанавіць у апараце НКА пасаду спэцыяльнага інспэктара для кіраўніцтва ШКМ., б) узмацніць кіраўніцтва школамі колгаснай моладзі з боку інспэктароў соцвыху АкрІНА з якой мэтай правесьці вылучэньне на інспэктарскую работу ў АкрІНА лепшых працаўнікоў ШКМ.

5. ЦК ЛКСМБ абавязвае ўсе комсамольскія організацыі ўключыцца ў работу па рэорганізацыі школ сялянскай моладзі, сямігодак і дзевяцігодак на вёсцы ў школы колгаснай моладзі, дамагаючыся найхутчэйшага палепшаньня якаснага выкананьня пастановы колегіі НКА і бюро ЦК ЛКСМБ аб рэорганізацыі школ сялянскай моладзі ў школы колгаснай моладзі.

АК ЛКСМБ праз паўтары месяцы прадставіць дакладныя запіскі аб ходзе рэорганізацыі школ і ўдзеле комсамольцаў у гэтай рабоце.

КОЛГАСНЫЯ КАДРЫ

З КОМСАМОЛЬСКІМ ЭНТУЗІЯЗМАМ ЗА СТВАРЭНЬНЕ НОВАЙ ШКОЛЫ НА ВЁСЦЫ

Школа сялянскай моладзі і ўся сыстэма масавай асьветы на вёсцы рыхтавалі людзей непатрэбных колектывізаванай вёсцы, а комсамольскія організацыі вельмі часта былі толькі гледачамі

ВЫЖЫВАЮЧЫ УНІВЭРСАЛІЗМ, ПАДРЫХТУЕМ КАДРЫ САПРАЎДНЫХ ОРГАНІЗАТАРАЎ І КІРАЎНІКОЎ АСОБНЫХ ГАЛІН СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГАСПАДАРКІ

Маруднасьць органаў нарасьветы ў рэорганізацыі ШСМ об'ектыўна стварае глебу для працягваньня варожай ідэолёгіі ў пытаньні падрыхтоўкі колгасных кадраў

Перабудова школ сялянскай моладзі ў школы колгаснай, у адпаведнасьці з задачамі партыі па соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, павінна была ісьці адпаведна з тэмпамі разгортваньня колектывізацыі з тым, каб у аснову работы школ пакласьці падрыхтоўку кадраў масавых спэцыяльнасьцяй для колгасаў.

Програма ШСМ, выданая Наркомасьветы ў 1928 годзе, ставіла зусім процілеглыя задачы. Яе ўстаноўка зводзілася да таго, што ШСМ „ставіць перад сабой задачу падрыхтаваць культурных вясковых сельскіх гаспадароў“. **Пытаньне колектывізацыі знаходзіць вельмі бледны адбітак у програме, бо таму пытаньню програма адводзіць апошняе месца.** Здавалася-б, што гэта програма павінна быць даўно скасавана і выкінута з ШКМ. **Аднак, недапушчальная марудныя тэмпы ў справе перабудовы работы ШКМ прывялі да таго, што гэтыя програмы яшчэ і зараз знаходзяцца ў школах, а Наркомасьветы ня так даўно прыслаў проэкт паправак (заўважце, проэкт!) да гэтых програм, своечасова не замяніўшы іх новымі.** Пастанова ЦК УсеЛКСМ аб перабудове ШСМ у ШКМ, якая мае важнейшае політычнае значэньне, упёрлася ў консэрватыўную сьцяну органаў нарасьветаўскага бюракратызму і не рэалізавана да гэтага часу. Такім чынам невыпадкова, што школы не змаглі карыстацца гэтымі програмамі. Прыходзілася перарабляць іх па свайму „смаку“.

Нам прышлося гутарыць з пэдагогічным пэрсоналам і кіраўнікамі Татаршчанскай нацыянальнай польскай школы колгаснай моладзі Койданаўскага раёну (між іншым, гэта школа сама перайменавалася), якія проста сьцьвярджаюць, што програма, а таксама проэкт паправак да яе ня ўвязаны з задачам падрыхтоўкі кадраў для колгасаў. Усе выкладаемыя ў школе дысцыпліны дрэнна ўвязаны з пытаньнямі колектывізацыі, а некаторыя з іх зусім да гэтага не прыстасоўваліся і не выпадкова, што самі пэдагогі гавораць аб дрэннай пабудове програмы нават і з навуковага пункту гледжаньня.

Колгасы зараз патрабуюць падрыхтоўкі для іх кіраўнікоў асобных галін гаспадаркі, але програма і проэкт паправак зусім гэтага не прадугледжваюць, таму здараецца, што школа ня мае пэўнай устаноўкі і рыхтуе кадры, ня ведаючы для каго.

У тых школах, дзе зусім не прытрымліваліся наркомасьветаўскіх „програм“, а самі перабудоўвалі работу так, як гэта дыктавалася жыцьцём, ёсьць некаторыя станоўчыя вынікі.

А ці ўсюды так? Мы ня маем аб гэтым сталых вестак, але мабыць не памылімся, калі скажам, што яшчэ ў частцы школ, дзе захаваліся консэрватыўныя спэцыялісты, пры такой увазе і кіраўніцтве з боку органаў нарасьветы, ёсьць неабходная глеба для правядзеньня чужой нам лініі.

Мы павінны патрабаваць ад Наркомасьветы самага рашучага ўзмацненьня тэмпаў па рэалізацыі пастановы ЦК УсеЛКСМ аб перабудове школ сялянскай моладзі ў школы колгаснай, і перабудовы ня толькі шляхам зьмены шыльды, але самага сталага вывучэньня ўсіх запатрабаваньняў перабудоўваемай на соцыялістычны лад сельскай гаспадаркі з тым, каб сапраўды дабіцца карэннай перабудовы ўсёй програмы школ, зрабіць яе адпавядаючай задачам падрыхтоўкі кадраў для колгасных гаспадарак.

Ня трэба ні ў якім разе забываць, што зараз барацьба за найхутчэйшую перабудову ШСМ зьяўляецца барацьбой за правільнае ажыцьцяўленьне лініі партыі ў пытаньні падрыхтоўкі кадраў для колектыўнай гаспадаркі. Гэтая барацьба зьяўляецца барацьбой з працягваньнем варожай нам ідэолёгіі на гэтым вучастку. Гэта барацьба зьяўляецца барацьбой з рэшткамі прышчэпаўшчыны, якая дзе-ні-дзе яшчэ захавалася ў школах.

М.

Баланс працы школ сялянскай моладзі.

Унівэрсал ШСМ у дзеяньні

Програмы і падручнікі школ сялянскай моладзі заставаліся з стаўкай на „культурнага гаспадара індывідуалістага“.



Вучань ШСМ убачыўшы на колгасным полі трактар:
— Што гэта за адзкая машына? Мае МАЗГІ ня ... могуць.

ВУЧНІ АБ ШКОЛЕ

Пляліся ў хвасьце жыцьця

Татаршчынская школа сялянскай моладзі організавалася ў 1927 годзе. Першы год свайго існаваньня школа працавала дрэнна. Вучыліся толькі 4 месяцы, а астатні час прышлося працаваць па апрацоўцы 70 гэктараў школьнай зямлі. Такім чынам, першы год вучобы быў у большасьці выкарыстан не для вучобы,—намі карысталіся, як дармовай рабочай сілай.

Другі год вучобы прайшоў больш організавана. Лік вучняў павялічыўся, стала больш працоўных адзінак, таму кожнаму вучню прыходзілася менш працаваць у гаспадарцы і рабіць пропускаў заняткаў, што палегчыла нашу вучобу і працу па апрацоўцы школьнай зямлі. Але вучоба ў ШСМ і другі год праводзілася без належнай увязкі вытворчай практыкі і вучобы. Школа ня мела сталай мэтавай устаноўкі, ня ведала каго яна павінна рыхтаваць. Вучоба першага і другога году праходзіла над вывучэньнем сельскай гаспадаркі „наогул“ і ніякага падзелу між практыкай I-га і II-га курсу ня было, калі ня лічыць тое, што вучні першага курсу ў зімовы час адбывалі практыку пад кармленьнем кароў, а вучні другога курсу—коняй. Больш ніякай розьніцы паміж вытворчай практыкай ня было. Вывучэньня-ж спэцыяльных галін сельскай гаспадаркі ня ўводзілася.

Да гэтага яшчэ трэба дадаць, што школа працавала па програме, выданай Наркамасьветы ў 1926 годзе, якая мела сваёй мэтай падрыхтоўку „культурных гаспадароў“ для сельскай гаспадаркі.

У працэсе працы школы з боку Наркомасьветы адсутнічала кіраўніцтва, і школа цягнулася ў хвасьце жыцьця. Працу нашай школы не накіроўвалі і не прыстасоўвалі да запатрабаваньняў колектывізаванай сельскай гаспадаркі. Вучні былі эдарваны ад удзелу ў колектывізацыі, бо цалкам выкарыстоўваліся на апрацоўцы школьнага вучастку.

У далейшай працы школы неабходна правесьці наступныя мерапрыемствы перадаць у карыстаньне колгасаў: 70 гэктараў школьнай зямлі, якая, з-за вялікай колькасьці, не дае магчымасьці наставіць прыкладнае вядзеньне гаспадаркі, што надзвычайна важна для акаляючых сялян, а перашкаджае і зрывае нармальныя ўмовы вучобы. Для практыкі вучняў, з прычыны далёкай аддегласьці колгасаў, неабходна пакінуць 5-10 гэктараў, на якіх школа сапраўды зможа разгарнуць вытворча-дасьледчую працу.

А таксама прапануем увесьці ў програму пачаткі вывучэньня спэцыяльных галін гаспадаркі з другога курсу (бо да гэтага часу першы і другі курсы займаліся вывучэньнем сельскай гаспадаркі наогул), і ўвесьці ў сыстэму навучаньня школы вывучэньне трактарнай справы, выкарыстаўшы маючуюся трактарную калёну.

**Вучні I-га II-га курсу:
13 подпісаў.**

Злучыць вучобу з непасрэднай практыкай у колгасе

Трэці год працы школы праходзіць некалькі ў лепшых умовах. Школа самастойна перабудавала програму па вывучэньню сельскай гаспадаркі, павялічыла лік гадзін вытворчай практыкі, прыстасаваўшы сваю працу да новых умоў—да задач падрыхтоўкі кадраў для колгасаў.

Школа на 3-м курсе, хаця і з некаторым спазьненьнем, увяла вывучэньне спэцыяльных галін сельскай гаспадаркі, разьбіўшы вучняў па сэкцыях: рахункаводы, жывёлаводы і г. д., што спрыяла ўзьняцьцю зацікаўленасьці вучняў і дало магчымасьць кожнаму з іх стала азнаёміцца з адной з галін вытворчасьці з тым, каб быць ня толькі працаўніком, але організатарам і кіраўніком яе.

Аднак трэба адзначыць, што хаця мы ў сваёй працы і зрабілі значны крок наперад—у бок наблізкэньня да задач колгасаў,—але-ж, дзякуючы непрыстасаванасьці ўсёй сыстэмы працы школы сялянскай моладзі і вучэбнага абсталяваньня, пры адсутнасьці кіраўніцтва з боку органаў Наркамасьветы і забясьпячэньня належнымі вучэбнымі прыладамі, мы поўнасьцю не змаглі выканаць сваёй задачы. Да гэтага трэба дадаць, што на працягу вучобы 1-га і 2-га курсу і першай паловы навучаньня 3-га курсу, мы займаліся вывучэньнем сельскай гаспадаркі і колгаснага будаўніцтва «наогул», да чаго прыстасаваны і адарваныя ад жыцьця падручнікі, якімі мы карысталіся, з пераходам-жа ў другой палове навучальнага году на сэкцыйны мэтад працы,—ня былі забясьпечаны програмамі, падручнікамі і плянамі вучэбна-практычнай працы, а таксама спэцыялістамі і агранамічнымі сіламі (у школе усяго адзін аграном). Толькі таму пастаўленую мэту—падрыхтаваць кіраўнікоў і організатараў асобных галін вытворчасьці ў колгасах,—мы ў дастатковай ступені ня выканалі (з 22 выпускнікоў 5-7 змогуць быць толькі кіраўнікамі).

Зусім дрэнна пастаўлена праца ў школе (і ў програме) па вывучэньню складаных машын, трактароў і г. д. А гэта магчыма было-б, каб Наркамасьветы паклапаціўся. У нас, нават у раёне, ёсьць трактарная калёна, і каб была програма заняткаў, школа змагла-б падрыхтаваць для колгасаў некаторую колькасьць трактарыстых.

Нарэшце мы прапануем у далейшай працы: пачаць з другога курсу працу сэкцыйным мэтадам на вывучэньню асобных спэцыяльнасьцяй у колектыўнай гаспадарцы. Павялічыць лік гадзін практыкі і выкарыстоўваць яе не ў школьнай гаспадарцы, а ў колгасах і больш гадзін адвесьці працы на дасьледчаму навучаньню. Надаць нашай школе, пры наяўнасьці ў раёне машынна-трактарных станцый і добра абсталяванай пры школе сталярнай майстарні, напрамак для падрыхтоўкі трактарыстых і будаўнікоў.

Група вучняў III курсу

Адносіны польскага ўраду і яго органаў да падзеі 26 красавіка не забясьпечваюць нармальных умоў працы поўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Польшчы

Абмен нотамі паміж СССР і Польшчаю па справе аб замаху на выбух саюзнага паўнамоцнага прадстаўніцтва ў Варшаве

31-га мая паўнамоцны прадстаўнік СССР у Польшчы Антонаў-Аўсеенка перадаў выконваючаму абавязкі міністра замежных спраў віцэ-міністру Высоцкаму ноту наступнага зьместу:

Пан міністар!

Нотаю ад 28 красавіка гэтага году саюзны ўрад зьвярнуў увагу ўраду польскай рэспублікі на сур'ёзнасьць становішча, якое стварылася ў выніку замаху на выбух памяшканьня паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Польшчы. Саюзнае прадстаўніцтва чакала, што ўрадам польскай рэспублікі, на якім ляжыць адказнасьць за бясьпечнасьць забясьпечаньня адпавядаючых нормам міжнароднага права ўмоў працы паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Польшчы, будуць прыняты энэргічныя эфэктыўныя мерапрыемствы з мэтаю прасячэньня злачыннай дзейнасьці тых фактараў у Польшчы, якія сыстэматычна імкнуцца выклікаць сур'ёзныя ўскладненьні ва ўзаемадачыненьнях паміж СССР і Польшчаю, ня спыняючыся дзеля гэтай мэты перад тэрарыстычнымі актамі супроць дыплёматычных прадстаўнікоў СССР. Не зважаючы на тое, што з моманту выкрыцьця замаху 26 красавіка мінула ўжо больш за месяц, саюзны ўрад прымушан констатаваць, што ён да гэтага часу ня толькі не атрымаў ад ураду польскай рэспублікі адказу на сваю ноту ад 28 красавіка г. г., але ня мае ніякага афіцыйнага паведамленьня, з якога было-б відаць, што польскаю ўладаю зроблены ўсе належныя вывады з такога важнага факту, як выкрыцьцё спробы выбуху памяшканьня паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Варшаве. Да гэтага часу ня толькі ня знойдзены вінаватыя ў арганізацыі гэтага замаху, але няма афіцыйных паведамленьняў, на падставе якіх можна было-б чакаць хуткага выкрыцьця ініцыятараў і выканаўцаў замаху 26 красавіка. З другога боку, як відаць з далучанай памятнай запіскі, не зважаючы на паведамленьне варшаўскай пракуратуры аб дазволе міністрам юстыцыі Царам азнаёміцца поўнамоцнаму прадстаўніцтву СССР з матар'ялямі дазнаньня, прадстаўніцтва ня толькі ня было дапушчана да такога азнаямленьня, але да гэтага часу ня можа атрымаць адбіткаў пратаколаў аб тых сьледчых дзеяньнях, у якіх удзельнічалі прадстаўнікі паўнамоцнага прадстаўніцтва, а таксама пратаколы экспэртызы выкрытага 26 красавіка выбуховага знараду.

Паказаныя вышэй адносіны польскага ўраду і яго органаў да падзеі 26 красавіка з выплываючымі адсюль вывадамі ня спрыяюць ліквідацыі небясьпечных варункаў у Польшчы, якія аблягчаюць дзейнасьць фактараў, што імкнуцца правакаваць конфлікты ў савецка-польскіх адносінах. Гэтая дзейнасьць выявілася таксама ў шэрагу зусім недапушчальных выпадаў польскай прэсы супроць паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР, ня спыняючыся перад абвінавачаньнем саюзных дзяржаўных органаў у арганізацыі замаху 26 красавіка, прычым маўчаньне польскай улады наконт гэтага замаху ня можа не паспрыяць распаўсюджаньню інсынуацый з боку злонамераных элемэнтаў.

Савецкі ўрад прымушан у сувязі з гэтым яшчэ раз зьвярнуць увагу ўраду польскай рэспублікі на сучаснае становішча, якое абцяжарвае савецка-польскія дачыненьні, на неабходнасьць ужыць рашучыя захады з мэтаю выявіць варункі замаху 26 красавіка, выкрыць вінаватых і спыніць злачынную дзейнасьць тых фактараў у Польшчы, якія імкнуцца да правакаваньня конфлікту паміж Польшчай і Савецкім Саюзам.

Саюзны ўрад чакае ад ураду польскай рэспублікі інформацыі па сутнасьці справы замаху на выбух паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР і ўжытых польскім урадам захадаў з мэтаю аховы паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у далейшым ад замахаў злачынных элемэнтаў.

Прымеце і г. д.

Антонаў-Аўсеенка.

Да ноты далучана памятная запіска, дзе падаецца факт, які сьведчыць, што польская ўлада, якая выказала спачатку згоду дапусьціць прадстаўнікоў паўнамоцнага прадстаўніцтва да азнаямленьня з матар'яламі дазнаньня па справе аб замаху, узяла пазьней гэтую згоду назад, запрапанаваўшы паўномоцнаму прадстаўніцтву атрымаць вусную інформацыю ад пракурора, які вядзе дазнаньне. Характар гэтай вуснай інформацыі прымусіў, аднак, паўнамоцнае прадстаўніцтва адмовіцца ў далейшым ад выкарыстаньня гэтага спосабу азнаямленьня са сьледчымі матар'яламі па справе аб замаху. У памятнай запісцы далей зазначаецца, што, не зважаючы на шматлікія звароты да міністэрства замежных спраў, паўнамоцнае прадстаўніцтва на працягу больш як месяцу не магло атрымаць пратаколу экспэртызы выкрытай 26 красавіка бомбы, а таксама пратаколаў агляду месца злачынства, складзеных у прысутнасьці прадстаўнікоў паўнамоцнага прадстаўніцтва.

5-га чэрвеня паўнамоцны прадстаўнік СССР у Польшчы Антонаў-Аўсеенка атрымаў у адказ ноту польскага ўраду наступнага зьместу:

Пан міністар!

Падцьвярджаючы атрыманьне вашых нотаў 28 красавіка і 31 мая г. г. па справе выкрыцьця бомбы ў коміне памяшканьня паўнамоцнага прадстаўніцтва Саюзу Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік у Варшаве на Пазнанскай вуліцы, маю гонар паведаміць наступнае: з моманту выкрыцьця памянёнай бомбы польскаю ўладаю бясьпекі, судовая ўлада, якой даручана дазнаньне па справе выкрыцьця вінаватых у, на шчасьце няўдалым замаху, з усёй пільнасьцю прыступіла да сваёй акцыі і ні на хвіліну ня спыняла ўзмоцненых росшукаў, накіраваных да вышэйнамечанай мэты. Тое, што вінавайцы замаху ня былі злоўлены на месцы злачынства, гэтак сама як і тое, што да гэтага часу не ўдалося ўстанавіць дакладнай даты праваджэньня электрычнага праваду на дах дому, суседняга з памяшканьнем пасольства Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, што, як відаць, магло нават мець месца за некалькі дзён да выкрыцьця гэтага праваду, выклікае сур'ёзныя ўскладненьні, якія абцяжарваюць дазнаньне для польскай судовай улады.

Хоць судовае дазнаньне натыкаецца, як гэта выплывае з вышэйпералічанага, на шэраг надзвычайна цяжкіх для вырашэньня загадак, аднак, усё-ж такі яно праводзіцца ў далейшым паскораным тэмпам, і можна выказаць надзею, што яно дасьць станоўчыя вынікі.

Дазваляю сабе таксама запэўніць Вас, міністр, што ўрад польскай рэспублікі, надаючы вялікае значэньне ўзмацненьню і паглыбленьню мірных дачыненьняў паміж польскай рэспублікай і Саюзам Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік, поўнасьцю разумее абавязкі, якія ўскладаюцца на яго ў моц неабходнасьці забясьпечыць бясьпеку і спакой прадстаўнікоў Саюзу Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік, акрэдытаваным на тэрыторыі польскай рэспублікі.

Прашу Вас, пан міністар, прыняць выказ паважаньня.

Аўгуст Залескі.

„Вялікі чалавек" у абкружэньні прыяцеляў

Старшыня сойму соцыялісты Дашынскі называе Пілсудзкага „вялікім чалавекам Польшчы", але яго абкружэньне ён характарызуе словамі: „жулікі, фальсіфікатары выбараў, кар'ерысты, паразіты, лёкаі".

ДАШЫНСКІ:—Жулікі... паразіты... кар'еры... ы... ы.. сты.. ы.

Іскры радыё

* Афіцыёзнае агенцтва Гомінь паведамляе, што згодна тэлеграмы Мо-Дэ-Гуй, атрыманай Нанкінскім міністрам замежных спраў, перамовы па пытаньнях УК чыгункі на савецка-кітайскай конфэрэнцыі распачнуцца 10 чэрвеня.

* У горадзе Лілоах (у Індыі) паліцэйскія стралялі ў бастуючых чыгуначнікаў, пры чым забілі чатырох з іх.

* Камісія Лігі Нацый у акупаванай Саарскай вобласьці забараніла дэманстрацыю саюзу Чырвоных Франтавікоў, але адначасова дазволіла наладзіць дэманстрацыю фашысцкім і іншым буржуазным арганізацыям.

Тэлеграмы

Растрэл сялянскай дэманстрацыі у Ду-Хоа

ПАРЫЖ, 8-VI. Газэта „Матэн" паведамляе аб расстрэле сялянскай дэманстрацыі ў буйным раённым цэнтры Кахінхіны Ду Хоа. Гэтая мясцовасьць ужо вядома па сялянскіх хваляваньнях за апошнія дні ў акрузе Шалён. На працягу цэлага дню адбываліся дэманстрацыі значнай масы сялян, якія патрабавалі падзелу абшарніцкіх земляў. Дэманстранты на чале з жанчынамі і дзецьмі рушыліся да памяшканьня, якое займаецца раённым начальнікам. Паліцыя распачала страляць і забіла 5 дэманстрантаў у ліку—кіраўнічку дэманстрацыі і паранілі 20 дэманстрантаў. „Матэн" з гэтым глуха паведамляе аб сутычках паміж паліцыяй і дэманстрантамі ў іншым раённым цэнтры акругі, вёсцы Бэнлук.

Усякія дэманстрацыі забаронены

ВЕНА 7. Урад Ніжняй Аўстрыі забараніў на лета ўсякія дэманстрацыі і сходы дэманстрацыйнага характару, ў 548 мясцовасьцях, у тым ліку амаль ва ўсіх больш менш значных прамысловых радох.

Праваднiку ленінскіх ідэй—XIII зьезду КП(б)Б—палкае комсамольскае прывітаньне

Мы, чытачы „Чырвонай Зьмены" гораду Бабруйску адзначаем правільную лінію партыі ў напрамку шпаркіх тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва і барацьбы з адхіленьнем ад генэральнай лініі партыі.

Мы ўпэўнены, што XIII зьезд КП(б)Б па-ленінску вырашыць усе задачы, якія зараз стаяць перад партыяй.

Чытачы „Чырвонай Зьмены" гораду Бабруйску запэўніваюць зьезд КП(б)Б, што мы, на грунце бальшавіцкай самакрытыкі, з усёй комсамольскай напорыстасьцю і энтузіязмам будзем змагацца за чыстату генэральнай лініі партыі і весьці рашучую барацьбу з усялякімі адхіленьнямі ад яе.

Комсамольскае прывітаньне XIII зьезду КП(б)Б!
Няхай жыве ЎсеКП(б) і яе ленінскі ЦК!
Няхай жыве штаб сусьветнай рэволюцыі—Комінтэрн!

Конфэрэнцыя чытачоў газэты „Чырвоная Зьмена" гораду Бабруйску.

Юнкоры пішуць

20 мая адбыўся першы выпуск студэнтаў Мазырскага Пэдтэхнікуму. Усяго скончыла 26 чалавек. Многія з выпушчаных атрымалі дрэнныя характарыстыкі. Сярод выпускнікоў—усяго 3 комсамольцы.

А. Рэзкі.

* * *

Комсамольскія ячэйкі Старадарожскага раёну (Бабруйшчына) шырока разгарнулі працу па збору сродкаў на пасылку комсамольцаў, батракоў, колгасьнікаў на экскурсію. Ня гледзячы на тое, што саюзы працасьветы, будаўнікоў і інш. ня толькі не дапамаглі райкому ЛКСМ, але стараліся нават сарваць экскурсію, усё-ж такі гэтая кампанія дала добрыя вынікі.

У першых лічбах чэрвеня ў Ленінград выяжджае 45 чалавек, з якіх—7 батракоў і 5 чалавек колгаснай моладзі. Грошы здабыты ад пастановак ячэйкамі культурна-масавых вечароў і спэктакляў.

М. Ш.

* * *

Комсамольцы, піонэры ды некаторыя вучні Дукорскай сямігодкі імя „16 партызан" у гэтым навучальным годзе ліквідавалі пяпісьменнасьць ста чалавек.

Г. Фрыд.

* * *

Сіламі студэнтаў Мазырскага пэдтэхнікуму арганізаваны курсы па падрыхтоўцы ў сярэднія навучальныя ўстановы.

Заняткі праводзяцца рэгулярна тры разы ў дэкаду. Рабочыя курсанты вельмі актыўна працуюць.

Трэба адзначыць, што бюро комсамольскага колектыву і прафорганізацыя працай курсаў цікавіцца мала.

А. Р—

* * *

У в. Карабовіцы, Смілавіцкага раёну, яшчэ ў 27 годзе Рудзінская пошта пачапіла паштовую скрынку. Але скрынка за ўвесь гэты тэрмін адчынялася ня больш як тры-чатыры разы. Лістаносец нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў.

Рысявец.

* * *

Комсамольцы м. Бягомля (Барысаўшчына) наладзілі суботнік, на якім выручылі 75 рублёў. Гэтыя грошы пойдуць на пабудову радыё ў шэфнай вёсцы Воўча.

А. Буз...

Паведамленьні

ФРК ЛКСМБ.—Заўтра 11 чэрвеня, а 7-ай гадзіне ўвечары ў памяшканьні РК адбудзецца нарада павадыроў фэрпостаў школ Фрунзэўскага раёну.

— Сёньня, а 6-ай гадзіне ўвечары, у памяшканьні ФРК адбудзецца пасяджэньне бюро ФРК.

— Сёньня, а 7-ай гадзіне ўвечары ў актавай залі БДУ адбудзецца агульны адкрыты сход колектыву ЛКСМБ БДУ.

Парадак дню:—Справаздача бюро колектыву аб пароробленай працы. 2.—Давыбары бюро колектыву.

Запрашаюцца студэнты унівэрсытэту.

Бюро колектыву ЛКСМБ БДУ

Адказны рэдактар Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599